13. *Рикёр, П.* Память, история, забвение / П. Рикёр. — М. : Изд-во гуманитар. лит., 2004. — 725 с.

14. *Хальбвакс, М.* Социальные рамки памяти / пер. с фр. и вступ. ст. : С. Зенкин / М. Хальбвакс. — М. : Новое издательство, 2007. — 547 с.

15. *Burke, P.* History as social memory / P. Burke // Memory, History and the Mind / Butler T. (ed). — Oxford, New York : Basil Blackwell, 1989. — 421 p.

16. Jrwin — Zarecka Iwona. Frames of Remembrance : The dynamics of Collective Memory. — New Brunswick (USA), London (UK) : Transaction Publishers, 2008. — 397 p.

17. *Nerone, J.* Professional History and Social Memory / J. Nerone // Communication. — 1989. — № 11. — P. 89—104.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таццяна Мармыш

магістр культуралогіі, супрацоўнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі (г. Мінск, Беларусь)



# Нематэрыяльныя «месцы памяці» ў структуры лакальнай ідэнтыфікацыйнай сістэмы супольнасці

«Глабальнае» і «лакальнае» — фактары ідэнтычнасці, што праяўляюцца ў кампліментарным суіснаванні тэндэнцыі да сусветнай інтэграцыі і ўніфікацыі жыццёвых форм і імкненні да захавання і развіцця этнакультурных адрозненняў, ростам лакальнай гетэрагеннасці і лакальных феноменаў быцця, — акрэсліваюць праблему лакальнай ідэнтычнасці ў сучаснай сацыякультурнай прасторы.

Лакальная ідэнтычнасць знаходзіцца ў аснове складанай іерархічнай структуры прасторава-тэрытарыяльнай ідэнтычнасці і адпавядае фацыяльнаму аспекту грамадскай свядомасці (жыхар «малой радзімы»), выяўленаму ў шэрагу з краінавым (жыхар краіны), адміністрацыйным (жыхар суб’екта адміні-

страцыйна-тэрытарыяльнага дзялення краіны), рэгіянальным (насельнік «натуральнага» рэгіёна), прасторавымі аспектамі, якія прадстаўляюць сабой базу фарміравання прасторава-тэрытарыяльнай ідэнтычнасці [6, *8*].

Лакальную ідэнтычнасць магчыма абазначыць як калектыўную і (або) індывідуальную, заснаваную на лакальнай культуры, звязаную з рэальна-геаграфічнай або міфалагічнай тэрыторыяй (месцам), яе спецыфічнымі грамадскімі, культурна-сімвалічнымі, эканамічнымі і інш. аспектамі, якія адрозніваюць яе ад іншых тэрыторый (месцаў). Для супольнасцей з лакальнай формай ідэнтычнасці характэрна замкнутая сістэма самазабеспячэння і адносная незалежнасць ад рознага кшталту кантактаў са знешнім асяроддзем (гаспадарчых, сацыякультурных і інш.).

Лакальная ідэнтычнасць на індывідуальным узроўні актуалізуецца праз ідэнтыфікацыю асобы з элементамі прасторава-тэрытарыяльнай структуры, утвараючых спецыфічную ідэнтыфікацыйную сістэму супольнасці. Гэта ідэнтыфікацыя з малой радзімай — месцам нараджэння і месцам пражывання; з асаблівасцямі ландшафту і клімату; з гісторыка-культурнымі падзеямі; з вядомымі гістарычнымі асобамі і сучаснікамі, з блізкімі людзьмі, сябрамі; з эканамічнай спецыялізацыяй тэрыторыі і ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця; з асаблівымі рэальнымі, або наўмысна прыпісваемымі рысамі калектыўных паводзін [4, *145*].



У працяг названым складнікам прасторава-тэрытарыяльнай структуры мы прапануем яшчэ адзін важны элемент — ідэнтыфікацыя з лакальнай спадчынай: з праяўленнямі нематэрыяльнай і аб’ектамі матэрыяльнай культуры. Усе пералічаныя складовыя часткі канструююць рэальнасць лакальнай ідэнтычнасці і насычаюць сэнсавае поле лакальнай тэрыторыі і лакальнай культуры.

Своеасаблівым вынікам «адкрыцця» множнасці відаў і разнастайнасці спадчыны, у тым ліку, дзякуючы аб’ектыўна-гістарычнаму тыпалагічнаму яе росту як «культурнага накаплення», у навукова-тэарэтычным і практычным аспектах стала замацаванне за культурнай спадчынай статусу рэсурсу ідэнтыфікацыі на нацыянальным і лакальным узроўнях. У падмурку такой трансфармацыі значэння спадчыны знаходзіцца катэгорыя «калектыўная памяць» М. Хальбвакса [9, *29*], канцэпты «месцы памяці» П. Нара [5, *26*], «культурная памяць» і «камунікатыўная памяць» Я. Асмана [1, *52*]. І для канцэпцыі калектыўнай памяці, і для катэгорый «месцаў памяці» і «культурнай памяці» базавым з’яўляецца меркаванне аб сувязі памяці і ідэнтычнасці, выказанае Х. Уль [11, *8*] і А. Мегілам [3, *133*].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праз названыя канцэпты раскрываецца змест тэрміна «нематэрыяльная спадчына» і можна рэканструяваць сувязь нематэрыяльнай спадчыны і ідэнтычнасці.

Лакальная ідэнтычнасць выражаецца ў адносінах да катэгорыі «месца». Гэта падкрэсліваецца сцверджаннем ідэнтычнасці ў агульным як лакалізацыі. Таму некаторыя даследчыкі акцэнтуюць увагу на існаванні наступных кампанентаў ідэнтычнасці: адчуванне і разуменне ўласнага месца, прасторы ажыццяўлення некаторага дзеяння (locale) праз кантэкстуалізацыю асобы ва ўзаемасувязях (networks), заснаваных на памяці (memory) [10, *167*]. Ключавой катэгорыя «месца» падаецца пры аналізе сувязей ідэнтычнасці, прасторы і ландшафту [8].

Адной з умоў лакальнай ідэнтыфікацыі з'яўляецца дыферэнцыяцыя прасторы, праз якую з'яўляецца магчымасць культурнай варыянтнасці, неаднароднасці культурнай прасторы і існавання яе лакальных варыянтаў, лакальных вопытаў і лакальных ідэнтычнасцей. Да дыферэнцыяцыі прасторы прыводзяць адрозненні прыродна-геаграфічнага асяроддзя і ўздзеянне рознага набору фактараў (сацыяльных, палітычных, гістарычных і інш.).



Далікатная прырода нематэрыяльнай культурнай спадчыны патрабуе перадачы «face-to-face». Персанальная кантактная перадача адбываецца найперш пры дапамозе «камунікатыўнай памяці» — памяці, ахопліваючай абмежаваны часавы прамежак прыкладна каля 80-і гадоў. Асабліва моцна сябе праяўляе камунікатыўная памяць у герметычных лакальных культурах з непасрэднай камунікацыяй. Для элементаў спадчыны фіксацыя ў камунікатыўнай памяці сведчыць пра станаўленне трансляцыі, але з пэўнай агаворкай: элементы павінны перайсці з камунікатыўнай памяці ў культурную, бо камунікатыўная памяць знікае разам са сваімі носьбітамі.

Канструяванне ідэнтычнасці праз зварот да культурнай спадчыны — арыенціра грамадскіх — супольнасцей у кожным выпадку адбываецца з пункту гледжання часавага і прасторавага сапраўднага «цяпер» для супольнасцей. Ідэнтычнасць і культурная памяць задаюцца некаторымі рамкамі з пазіцыі штодзённасці (дня ўзнікнення рамак). Супольнасці памяці становяцца кропкамі канструявання асабовай ідэнтычнасці і ўключанасці ў лакальную гісторыю супольнасці.

Часам па-за рамкай могуць заставацца суб'ектыўна выбраныя ідэалагічна непрывабнымі элементы спадчыны, сегменты культурнай памяці. Напрыклад, новыя лозунгі і ідэалы пабудовы «светлай будучыні» ў савецкай дзяржаве выцеснілі і паставілі ў сітуацыю забароны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маштабны пласт традыцыйнай народнай культуры. Менавіта такім чынам часта канструююцца афіцыйная культурная памяць і афіцыйныя «месцы памяці» і нематэрыяльная спадчына сур'ёзна ідэалагічна нагружаецца. Згодна з меркаваннем А. Васільева, падобная пастаянная рэарганізацыя мінулага і культурнай памяці ёсць норма, а карані яе — у ідэі непазбежнага адаптавання новых з'яў супольнасцямі, перыядычнага ажыццяўлення пераінтэрпрэтацыі мінулага з мэтай уключэння новага ў тканіну гістарычнай традыцыі [2, *60*].

У розных супольнасцях існуе (для кожнай — свой) дастаткова канстантны канон мемарыяльных арыенціраў. Кананічны каркас «нанізваецца» неабходнымі элементамі (аб'ектамі) памяці з сэнсамі, дзе закумуляваны адказы на выклікі часу. Таму ідэнтычнасць асобы або супольнасці ў сваю чаргу адыгрывае важную ролю ў працэсе выяўлення нематэрыяльнай спадчыны.

Жыццядзейнасць нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей — НКС) абумоўлена суб'ектным характарам спадчыны, бо жывыя нематэрыяльныя элементы культурнай спадчыны не могуць існаваць па-за носьбітам-суб'ектам і рэалізуюцца ў сферы быцця чалавека.



У дзяцінстве з дапамогай камунікатыўнай памяці праз сям'ю, таму што менавіта сям'я з'яўляецца традыцыйным інстытутам трансляцыі НКС (а ўжо толькі пасля — знешнія сацыяльныя структуры, фармальная і нефармальная адукацыя і інш.), пачынае адбывацца часцей неўсвядомленае засваенне НКС. Адбываецца кантэкстнае засваенне НКС — асоба жыве ў лакальнай культуры з дзяцінства, ад нараджэння ўспрымае і засвойвае ўсе яе праявы, удзельнічае ў іх натуральным сацыяльным існаванні. Першаснае фарміраванне ведаў (пакуль несістэмных) аб уласнай прыналежнасці таксама адбываецца ў маленстве. На гэты працэс найперш уплывае сям'я і блізкае сацыяльнае атачэнне. Праблем з ідэнтыфікацыяй у асобы ў дадзены перыяд не ўзнікае дзякуючы дзеянню механізма пераймання. Далей, разам з усталяваннем дакладнай самаідэнтыфікацыі з некаторай групай у поўным аб'ёме з выдзяленнем падстаў ідэнтыфікацыі адбываецца экстравертнае сцверджанне сваёй ідэнтычнасці праз (свядомае ці несвядомае) увасабленне розных відаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Бытаванне НКС пры гэтым набывае ўстойлівасць.

Любы падзел на этапы жыццёвага цыкла НКС будзе ўмоўным, бо немагчыма засвойваць веды, звязаныя з элементам спадчыны не практыкуючы непасрэдна сам элемент і, тым болей, складаным уяўляецца канкрэтызацыя перыяду, калі НКС пераходзіць з камунікатыўнай памяці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў культурную. Першапрычына гэтай складанасці палягае ў тым факце, што жыццядзейнасць НКС у адносінах да аднаго чалавека — паступальная лінейная (чалавек нараджаецца, засвойвае нематэрыяльную культурную спадчыну, увасабляе ў жыццё, перадае, памірае), але цыклічная ў адносінах да жыцця розных генерацый лакальнай супольнасці цалкам, бо лакальную супольнасць утварае пэўная колькасць дзеячаў-актараў рознага ўзросту, праходзячых розныя перыяды «стасункаў» з НКС адначасова.

Працэс ідэнтыфікацыі здольны адбывацца не толькі ў дзяцінстве, бо розныя абставіны на працягу жыцця могуць указваць чалавеку на неабходнасць пераасэнсавання сваёй прыналежнасці. Так і ў дачыненні да нематэрыяльнай спадчыны: уключэнне чалавека ў кантэкст яе перадачы і ўвасаблення ў сучасным грамадстве можа адбывацца на любым этапе жыцця праз «прысваенне» вуснай нематэрыяльнай культуры, уласцівай асобна ўзятай лакальнай супольнасці. Гэта прысваенне ажыццяўляецца пры асабістым ўдзеле ў камунікацыйным акце перадачы нематэрыяльнай культуры і азначаецца ўспрыманнем яе ў якасці «сваёй». Пры матывацыйна абгрунтаваным вывучэнні фіксаваных форм задакументаванай нематэрыяльнай спадчыны і «прымяненні іх на практыцы» (напрыклад, рэканструкцыі абраду) можна меркаваць аб прысутнасці некантэкстнага спосабу прысваення НКС. Таксама назіраецца і змешаная форма прысваення нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Яна ажыццяўляецца праз непасрэдныя кантакты з носьбітамі асоб без цеснай генетычнай сувязі з антрапагеаграфічным локусам бытавання НКС.



Нематэрыяльная спадчына з'яўляецца ідэнтыфікатарам нацыянальнай беларускай культуры, уключаючай культуры тытульнага этнасу нацыі і нацыянальных меншасцей, пражываючых на тэрыторыі краіны, а таксама для ўласна беларускай культуры — уласцівай толькі беларускаму этнасу. Разам з тым нематэрыяльная спадчына канкрэтнай сацыякультурнай супольнасці, выражаючы яе гісторыка-культурныя здабыткі, прадстаўляе сабой агульначалавечую каштоўнасць, скарб сусветнай культуры. У пацвярджэнні чаго можна прывесці наяўнасць спісаў ЮНЕСКА — Рэпрэзентатыўнага спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны і Спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якой патрабуецца тэрміновая ахова.

Элементы нематэрыяльнай культуры агульнанацыянальныя па сваім значэнні, але па паходжанні і геаграфіі бытавання заўсёды вузкалакальныя, належаць лакальнай супольнасці і існуюць у лакальнай культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў межах пражывання некаторай сацыякультурнай супольнасці (дзяржаўна-тэрытарыяльнай адзінкі) і мясцовым ландшафце.

У «адзінках» НКС фіксуецца прыналежнасць асобы-носьбіта спадчыны да локуса быцця і імкненне да тэрытарыяльнай ідэнтыфікацыі з ландшафтам укаранення элемента спадчыны. Нематэрыяльная культурная спадчына выступае локусам акумуляцыі назапашаных пакаленнямі каштоўнасцей, транслюе ў знешняе асяроддзе каштоўнасці і сэнсы, адлюстроўвае, у тым ліку, і каштоўнасць лакалізацыі асобы.

Фарміраванне асабовай ідэнтычнасці ёсць уваходжанне ў сацыяльную рэчаіснасць. Яна знаходзіцца ў аснове выкрышталізацыі сістэмы асабовых сэнсаў праз уключэнне ў сэнсава-каштоўнаснае поле іншага суб’екта ці групы; а таксама праз атаясамліванне з культурнымі кодамі і знакамі, вядомымі толькі тым, хто спазнаў культурную ініцыяцыю. Такімі культурнымі кодамі, сімваламі насычаныя элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Элементы НКС тыповыя для ідэнтытэту супольнасці-локуса іх бытавання; унікальныя ў сацыяльным, эстэтычным, культурным планах для лакальнай тэрыторыі, рэгіёна, і знакавыя для насельніцтва гэтай тэрыторыі. Уключэнне асобы ў камунікацыйныя акты і фрэймы, што прымаюць выгляд розных форм перадачы нематэрыяльнай культурнай спадчыны і захоўваюць архаічныя семантыка-сімвалічныя парадыгмы лакальнай культуры, спрыяе самаўсведамленню асобы часткай супольнасці, для якой характэрны ўзнаўляемыя ў нематэрыяльных формах і праяўленнях творчасці чалавека каштоўнасці і сэнсы. Утвораны шляхам трансляцыі аксеалагічнай базы агульны для супольнасці кантэкст, уплывае на яе цэласнасць, аб’ядноўвае адносна агульнага светаадчування і светаўспрымання, забяспечвае сцверджанне культурнай самабытнасці і ідэнтычнасці.

Ідэнтычнасць можа адлюстроўвацца ў элементах спадчыны падобна да фактаў біяграфіі асобы, напрыклад, калі ўключэнне ў працэс узнаўлення (увасаблення) нематэрыяльнай спадчыны набліжаецца па змесце да ініцыяцыі, атрымання новага статусу ў лакальнай супольнасці, спецыфічнае маркіраванне асобы. Так, удзел ў абрадзе «Калядныя цары» традыцыйна бяруць толькі маладыя нежанатыя хлопцы. У аўтэнтычным варыянце бытавання абраду (да перапынку з канца 1960-х гг.) «цары» найперш разыгрывалі дзею ў хатах, дзе жылі незамужнія дзяўчаты, імаверна каб «паказаць» сябе ў перыяд уступлення ў шлюбны ўзрост. Допуск супольнасцю да ўдзелу ў «царах» сімвалізаваў уваходжанне маладога чалавека ў перыяд шлюбнага ўзросту. Аднак



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасля адраджэння абраду ў канцы 1990-х гг. па аб'ектыўных прычынах гэта функцыя знівеліравалася. Сёння ўдзельнікі абраду — не толькі нежанатыя хлопцы ды і прынцыпы выбару хаты для калядавання змяніліся.

Культурна-гістарычнае сцверджанне лакальных супольнасцей залежыць ад адмысловай ідэнтыфікацыі са «сваёй» спадчынай, «сваёй» гісторыяй, «сваёй» культурай. Сёння ахова спадчыны, у тым ліку нематэрыяльнай, выконвае ролю механізма культурнай, нацыянальнай ідэнтыфікацыі, а ў дачыненні да носьбітаў нематэрыяльнай спадчыны — інструмента лакальнай самаідэнтыфікацыі. Таму нельга не пагадзіцца са сцверджаннем: «спадчынная дзейнасць», у якасці сродку і механізма ідэнтыфікацыі «робіць тую або іншую супольнасць гістарычнай» [7, *31*].

Падводзячы вынік, можна меркаваць аб паўставанні лакальнай ідэнтычнасці ў тым ліку і на разуменні членамі супольнасці агульнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, рэпрэзентуючай частку калектыўнай культурна-гістарычнай памяці. Лакальная па сваёй прыродзе нематэрыяльная культурная спадчына забяспечвае перадачу ведаў, звязаных з элементамі НКС, што з'яўляюцца «месцамі памяці» і замацоўваюць ідэнтычнасць членаў супольнасці праз пастаянства ўвасаблення і, тым самым, садзейнічаюць утварэнню, узнаўленню і захаванню лакальнай ідэнтычнасці.



Элементы нематэрыяльнай культуры ўяўляюць сабой «месцы памяці» ў некалькіх значэннях. Першае — сімвалічна-сэнсавае, узнікае з ведаў, інфармацыі, суправаджаючых практыку элементаў НКС, укарэнена ў неасязальную сутнасць такіх форм культуры. Другое значэнне паўстае на існаванні кантынуума паміж метафізікай (духоўнасцю) НКС і матэрыяльнымі аб'ектамі, якія яе суправаджаюць і маркіруюць у прасторы.

Ва ўмовах сацыякультурных перамен асноватворная ў жыццядзейнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны пераемнасць складае фундамент ідэнтычнасці лакальнай супольнасці. Пераемнасць НКС скіравана на падтрымку ідэнтычнасці найчасцей непасрэдна суб'ектаў пераемнасці і прадугледжвае неабходнасць захавання лакальнага «сацыяльнага працэсу», абумоўліваючага жыццядзейнасць нематэрыяльнай культуры, а таксама прыняцця суб'ектамі пераемнасці значных для ідэнтычнасці лакальнай супольнасці змен (сацыяльных, эканамічных, матывацыйных, каштоўнасных і інш.). Менавіта з гэтай прычыны ўяўляецца своечасовай пастаноўка аксіяматычнай мэты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

станаўлення пераемнасці спадчыны каштоўнасцю-арыенцірам усяго грамадства.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Ассман, Я.* Культурная память / Я. Ассман. — М. : Яз. славян. культуры (Кошелев), 2004. — 363 с.

2. *Васильев,* А. Мемориализация и забвение как механизмы производства культурного единства и разнообразия / А. Васильев // Фундаментальные проблемы культурологии : в 7 т. — Т. 6 : Культурное наследие : от прошлого — к будущему // М-во культуры РФ, С.-Петербург. отд-ние Рос. ин-та культурологии, Каф. ЮНЕСКО по компаратив. исслед. духов. традиций, специфических культур и межрелигиоз. диалога ; [отв. ред. Д. Л. Спивак]. — М. ; СПб. : Новый хронограф : Эйдос, 2009. — С. 56—68.

3. *Мегилл, А.* Историческая эпистемология / А. Мегилл. — М. : Канон+, 2009. — 479 с.

4. *Морозова, Е. В.* Локальная идентичность : формы актуализации и типы / Е. В. Морозова, Е. В. Улько // Политэкс : Политическая экспертиза. — 2008. — № 4. — С. 139—151.

5. *Нора, П.* Между памятью и историей / П. Нора // Франция-память : сб. / С.-Петербург. гос. ун-т, [пер. с фр., послесл. Д. Хапаевой]. — СПб. : Изд-во С.-Петербург. ун-та, 1999. — С. 17—148.

6. *Павлюк, С. Г.* Традиционные и исторические районы как форма территориальной самоорганизации общества (на примере США и России) : автореф. дис. … канд. геогр. наук : 25.00.24 / С. Г. Павлюк ; Моск. гос. ун-т. им. М. В. Ломоносова. — М., 2007. — 26 с.

7. *Пископпель, А. А.* О горизонтах наследнической деятельности / А. А. Пископпель, В. Р. Рокитянский, Л. П. Щедровицкий // Наследие и современность : информ. сб. — М. : Институт наследия. — 2007. — Вып. 14. — С. 15—34.

8. *Симонова, В. В.* Культура как машина времени : интерпретация пространства / В. В. Симонова // Журнал социологии и социальной антропологии. — 2006. — Т. 9. — № 3. — С. 110—128.

9. *Хальбвакс, М.* Социальные рамки памяти / М. Хальбвакс. — М. : Новое издательство : А. Курилкин, 2007. — 346 с.

10. *Preston, P. W.* Locale, Network and Memory / P. W. Preston // Political Cultural Identity. Citizens and Nations in a Global Era. — London, 1997. — P. 167—187.

11. *Uhl, H.* Warum Gesellschaften sich erinnern / H. Uhl // Erinnerungskulturen. Informationen zur Politischen Bildung. — 2010. — Nr. 32. — P. 5—14.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ